WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛІПЕНЯ 2011 г. СУБОТА
№ 138 (27002)
Кошт 750 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Стыхія

### ПАДЧАС НЕПАГАДЗІ ЗАГІНУЛА ДЗІЦЯ

**Паводле аператыўных звестак Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, з-за праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру да 15-22 метраў за секунду 21-22 ліпеня пацярпелі 72 населеныя пункты ў Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях.**

Усяго былі пашкоджаныя дахі 32 прыватных жылых дамоў і 113 сельскагаспадарчых будынкаў. У Гродзенскім раёне пашкоджана 150 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, у Крупскім раёне — 3 гектары лесанасаджэнняў.

У 18.30 каля вёскі Церабуты Старадарожскага раёна парывам ветру перакуліла металічны навес прыпыначнага пункта грамадскага транспарту. Быў смяротна траўмаваны хлопчык 1999 года нараджэння...

Навальнічны разрад маланкі стаў прычынай пажару ў сенасховішчы адкрытага акцыянернага таварыства «Агранёманскае» ў вёсцы Драздзы Стаўбцоўскага раёна. Агонь знішчыў 16 тон сена ў рулонах, пашкодзіў яшчэ 45 тон, а таксама шыферную частку будынка. Пацярпелых, на шчасце, не было.

У гарпасёлку Зэльва з-за парываў ветру абрынулася цагляная сцяна склада Зэльвенскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства на мікрааўтобус, што быў прыпаркаваны каля будынка. Атрымаў траўмы лёгкай ступені кіроўца, які быў дастаўлены ў бальніцу. Пасля аказання медыцынскай дапамогі яго адпусцілі дадому.

Па звестках ДВА «Белэнерга», на тэрыторыі краіны было абястачана 648 населеных пунктаў. На 6 гадзін раніцы ўчарашняга дня ў такім стане заставалася 199 населеных пунктаў, аднак аварыйныя брыгады вялі актыўныя аднаўленчыя работы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### БЕЗ ТЭЛЕФОНА І ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

**21 ліпеня ў Магілёўскай вобласці шквалісты вецер да 15-20 метраў у секунду нарабіў бяды, паведамілі ў Магілёўскім УМНС. Дахі дзесяці будынкаў пашкоджаны ў Быхаўскім, Горацкім і Мсціслаўскім раёнах. Там вядуцца аднаўленчыя работы.**

У Бялыніцкім раёне засталіся без электрычнасці 22 населеныя пункты і 11 фермаў. Электразабеспячэнне ў раёне аднавілі да 7 гадзін раніцы наступнага дня.

Ад навальніцы ў Крычаўскім раёне адключыліся дзве аўтаматычныя тэлефонныя станцыі ў вёсках Сычык і Луты. Там можна было карыстацца сотавымі тэлефонамі для выкліку экстранных службаў, а праз 2,5 гадзіны была адноўлена і правадная тэлефонная сувязь.

**Ілона ІВАНОВА.**

### ВЕЦЕР ШЫФЕР ЗНОСІЦЬ

**З поўдня Палесся прыходзяць звесткі аб разбурэннях, якія нанёс моцны вецер у чацвер вечарам.**

Рэчыца аказалася часткова адключанай ад электраэнергіі, як і 11 населеных пунктаў у Ельскім раёне. У Калінкавіцкім, як і ў Петрыкаўскім раёне, такіх вёсак па 5, але вецер пашкодзіў і будынкі. Часткова без дахаў засталіся пабудовы ў КСУП «Ульянава» (в. Колкі): майстэрні, важніца, піларама, падстрэшак для сельгастэхнікі, зерняскладзы, летні лагер, МТФ. У Лельчыцкім раёне знесена 4000 лістоў шыферу з даху падстрэшка на малочнатаварнай ферме прадпрыемства «Зара Палесся». У Глушкавічах часткова без дахаў засталіся падстрэшак для тэхнікі і дзіцячы садок. Больш за іншых пацярпела Мазыршчына. Шыфер зляцеў з 3 кароўнікаў і 2 падстрэшкаў для цялят у вёсцы Козенкі, з 3 свінафермаў, 5 кароўнікаў, 3 зерняскладоў у вёсцы Гурыны. Пашкоджана 200 гектараў кукурузы «Эксперыментальнай базы «Крынічная». У Палескім філіяле РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па земляробстве» разбураны драўляны будынак склада, дзе знаходзілася лінія па ачыстцы насення травы. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, гэтыя звесткі пастаянна абнаўляюцца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ВІЦЯБЛЯН АБУВАЮЦЬ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

...на адной з пешаходных вуліц. Скульптура-сімвал колішняга шаўца ўпрыгожыла гістарычную частку Віцебска і адразу палюбілася маленькім жыхарам паўночнай сталіцы.

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЛЕГКАВІК СУТЫКНУЎСЯ З АЎТОБУСАМ

**Пра гэта здарэнне ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС у 3 гадзіны ночы паведаміў інспектар-дзяжурны УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама. Сутыкненне адбылося на праезнай частцы па вуліцы М. Багдановіча, 198, былі пацярпелыя, патрабавалася дэблакіроўка.**

На месцы высветлілася, што сутыкнуліся легкавы аўтамабіль «Міцубісі Экліпс» і дзяжурны аўтобус МАЗ-103. Апошні належаў філіялу «Аўтобусны парк №4» дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс». У выніку дарожна-транспартнага здарэння ў легкавіку пацярпелі кіроўца і тры пасажыры, адзін з іх — дзіця 2008 года нараджэння. Яны з пашкоджаннямі рознай ступені цяжкасці былі дастаўлены ў бальніцу хуткай дапамогі. Аднаго з пасажыраў легкавога аўтамабіля — дзяўчыну 1993 года нараджэння — выратавальнікі даставалі з дапамогай гідраўлічнага інструмента.



**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### МІНСКАЯ МІЛІЦЫЯ І СУПРАЦОЎНІКІ КДК ЗАТРЫМАЛІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНУЮ ГРУПУ ВАЛЮТЧЫКАЎ

**Групу валютчыкаў, якая складалася з грамадзян Беларусі, Азербайджана і Ірана, затрымалі сталічныя аператыўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі і супрацоўнікі дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама.**

Арганізатара — 40-гадовага грамадзяніна Азербайджана — затрымалі на рынку «Экспабел» у момант заключэння чарговай здзелкі па абмене долараў ЗША на беларускія рублі. Паводле існуючай у міліцыянераў інфармацыі, з чэрвеня гэтага года азербайджанец, з дапамогай 5 змоўшчыкаў, грамадзян Ірана і Беларусі, атрымаў даход звыш Br50 млн, а сумы некаторых здзелак даходзілі да $30-40 тыс.

На гэты момант адносна падпольнага валютчыка заведзена крымінальная справа па арт. 233 «Незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць» КК Беларусі. Вырашаецца пытанне аб прыцягненні да крымінальнай або адміністрацыйнай адказнасці саўдзельнікаў затрыманага, якія ажыццяўлялі скупку валюты.

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## ШТАБ ПА КАНТРОЛІ ЗА ХОДАМ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

**створаны пры Савеце Міністраў, паведаміў БЕЛТА намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Валерый Іванocc.**

У ближэйшыя некалькі дзён члены штаба ў складзе рабочых груп наведаюць рэгіёны, дзе на месцах азнаёмяцца са станам спраў, арганізацыяй сельскагаспадарчых работ. Перад аграрыямі пастаўлена задача мінімізаваць страты, урадзай збожжа ў аптымальныя тэрміны і якасна. Трэба выкарыстоўваць любую магчымую хвіліну, пры гэтым да кожнага поля трэба падыходзіць індывідуальна, паколькі назіраецца нераўнамернае высяванне збожжавай нівы. Галоўным крытэрыем пры прыняцці рашэння павінна быць аб'ектыўная ацэнка магчымых рызык. Выбар трэба рабіць на карысць таго, каб страты былі мінімальныя.

За няякасную ўборку збожжавых перадавыя будуць знімацца з рэспубліканскага спаборніцтва працаўнікоў вёскі, падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі. У мінулым годзе былі факты, калі перадавыя камбайнеры, якія намалацілі 2, 3, 4 тыс. тон збожжа, дапускалі значныя страты, ставячы сабе за галоўную мэту намалаціць як мага больш тон.

«Дадзена даручэнне знімаць са спаборніцтва, нягледзячы на заслугі, тых камбайнераў, якія набіваюць хутка бункер і пры гэтым страчваюць збожжа. Такога быць не павінна», — сказаў Валерый Іваноў. Галоўны пакзчык у бягучай уборачнай кампаніі — змяншэнне страт. Якасць жніва — на асаблівым кантролі, за ходам уборкі на палях будзе сачыць Дзяржтэхнагляд. За няякасную ўборку ўзнагарод могуць пазбавіцца механізатары, гаспадаркі, раёны і вобласці, якія дапусцілі неаб'ектыўныя страты.

### Сярэдняя зарплата ў чэрвені склала Br1 млн 782 тыс. 857

**Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у чэрвені гэтага года склала Br1 млн. 782 тыс. 857.**

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Для параўнання: у маі гэты паказчык быў роўны Br1 млн 648 тыс. 669. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у чэрвені гэтага года склала Br1 млн 799 тыс. 416 (у маі яна была Br1 млн 662 тыс. 707).

Парламенцкая кухня | Пра палітыку са смакам

# АНТЫКРЫЗІСНАЯ ВЯЧЭРА

Ала МАЧАЛАВА

**Цэны на прылаўках зараз «кусаюцца», але ад гэтага нам не стала хацецца менш самім чагосьці кусануць. Ды хто ногуць сказаць, што каб смачна пад'есці, трэба патрацісь шмат грошай?! Наша вячэра з дэпутатам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Святланай ПІШЧ даказвае адваротнае.**

Запечаная да храбусткай скарыначкі, любая рыбка становіцца залатой! І зусім неабавязкова раскашэльвацца на тэлапію з пангасіусам, пакуль у крамах прадаецца мойва па 9 тысяч за кіло. А ўжо бульбу беларус дзе-небудзь знойдзе! Гараджанін і той на лецішчы выкапае. Апетытна падсмажаная, з хрусткай рыбкай, яна любога змусіць праглынуць язык ад апетыту!

— Мойва гатуецца простым сялянскім спосабам: солім, абвальваем у муцэ — і ў духоўку, — кажа гаспадыня і суправаджае свае словы спрытнымі дзеяннямі.

Пра сялянскі спосаб Святлана Пішч кажа не з чужых слоў — сама вырасла ў вёсцы. На святой жыровіцкай зямлі.

— Заўжды пра гэта помню і з асаблівым хваляваннем стаўлюся да гэтага, — прызнаецца суразмоўніца.

Вырасла яна ў шматдзетнай сям'і — чацвёра іх было ў бацькоў. Праўда, тады, кажа, гэта было зусім і не шмат, а звычайная рэч. Сялянскі ўклад жыцця навучыў і сена сушыць, і карову даіць, а ўлюбёным напамінам пра дзяцінства зрабіў смак свежага хлеба з малаком.



Наша сённяшняя суразмоўніца — з тых людзей, пра каго кажуць: на ёй шкура гарыць і работа ідзе спорна. Адсюль і кухарскае крэда: ніводная страва не павінна адымаць больш за гадзіну. Відаць, усяму «віной» жыццялюбства: яна імкнецца перажыць як мага больш пазітыўных момантаў і, здаецца, хоча пад завязку напоўніць кожны пражыты дзень. І пачынае, як і ўсе жаўрукі, з самага ранку. Калі для некага няма лепшага сродку падбадзёрвання, чым кава, то для нашай суразмоўніцы ранак не ранак без зарадкі.



— Я раблю бодзіфлекс — гэта фізічныя практыкаванні ў комплексе з дыханнем. 15-ці хвілін мне дастаткова, каб прыйсці ў тонус і добра сябе адчуваць.

У прывабнай і дагледжанай жанчыны і захапленняў багата. У вольны ад парламенцкай працы час паспявае на курсы англійскай мовы з калегамі, у лазню з сяброўкамі, на прабежку ў парк з сынам. З пачаткам яе дэпутацкай кар'еры сям'я Пішч літаральна падзялілася напалам. Святлана жыве ў Мінску разам з малодшым сынам, які вучыцца тут, а муж і старэйшы сын — у Баранавічах.

— Езджу да іх кожныя выхадныя, — дзеліцца з намі суразмоўніца.

Для сям'і няма лепшага адпачынку, чым выехаць з палаткай у лес, купацца ў возеры і не думаць пра будзённыя клопаты.

Кулінарны экспрэс-метад Святланы Пішч у ліку галоўных інгрэдыентаў прадугледжвае не толькі хуткасць, але і добрыя думкі. З імі ежа смачнейшая, перакананая гаспадыня, і на карысць пойдзе.

— Кіраваць сваімі думкамі абавязкова, — дзеліцца з намі спадарыня Пішч, якая апошнім часам захапілася кнігамі па псіхалогіі, самаразвіцці. — Мы настолькі развучыліся пазітыўна думаць, няўпэўненыя ў сабе, у нас шмат комплексаў, мы не ўмеем сябе любіць. А так проста быць шчаслівымі — дастаткова толькі настроіць сябе на гэта.

І ў яе, відавочна, гэта атрымліваецца: усмешлівая, гумарная, яна літаральна выпраменьвае пазітыў. Да такога чалавека, бадай, лягчэй звярнуцца са сваёй праблемай...

А пакуль наша рыбка залаціцца ў духоўцы, распытваем народную выбранніцу, ці адчувае яна нейкую напружанасць на прыёмах у сваёй баранавіцкай акрузе, ці стала больш скаржнікаў.

— Я пастаянна наведваю прадпрыемствы, і ведаеце, атмасфера там спакойная, усе неяк «круцяцца». Асартымент змяняюць, на экспарт выходзяць. Вынаходзяць нешта, каб утрымацца на плаву. Увогуле хачу сказаць, што людзі ў нас аптымісты. Усе неяк трымаюцца і настроеныя пазітыўна. А як інакш?! Не мы выбіраем — час выбірае нас для выпрабаванняў. Так, паясы сёння трэба зацягваць. Але зараз якраз той момант, калі можна ўзважыць, наколькі добра мы жылі раней, колькі маглі сабе дазволіць. Для ўсіх нас гэта не лішні напамін: трэба цаніць тое, што маеш.

Стаўленне да просьбітаў і скаржнікаў у яе змянілася пасля знаёмства з адным чалавекам:

— У нас ёсць адна жанчына, яе завуць Еўфрасіння, і яна... насамрэч святая. У свае 87 гадоў яна даглядае аднагодкаў і нават маладзейшых: каму па прадукты сходзіць, каму па дамоўку, каму звяжа нешта. Яна прысвячае жыццё таму, каб дапамагаць, аддаваць. Нават сваю сціплую пенсію яна лічыць вялікай і ўвесь час пазычае тым, каго апякае. І вы не ўяўляеце, наколькі кантрастна на яе фоне выглядаюць тыя, хто прывык толькі прасіць. У кагоо гэта сістэма, хто ходзіць па ўсіх інстанцыях і нешта сабе выбівае. На жаль, ёсць такія людзі, у якіх выключна карыстальніцкі падыход да жыцця. Усё павінна быць у меру. Дзіву даешся, калі бачыш, наколькі па-рознаму вядуць сябе людзі ў абсалютна аднолькавых умовах. Пастаянна хацець лепшага — зразумела і натуральна. Але ўмець задавальняцца тым, што ёсць — часам зусім няблага.

У акрузе Святлану Пішч ведаюць ледзь не як выратавальніцу ад алкагалізму. Сама яна такой славы не шукала, проста, як гэта часта бывае ў жыцці, аднойчы не змагла застацца ў баку. Дэпутата-ўраджэнку святой жыровіцкай зямлі запрасілі на тамтэйшы «круглы стол» па праблемах алкагольнай залежнасці, які ладзіла епархія. Унікнуўшы ў сітуацыю, яна вельмі ўразілася:

— Мяне як ускалыхнула тады. Трэба ж нешта рабіць!

Пачала з малога — дапамогі канкрэтнаму чалавеку.

— Да мяне прыйшла жанчына, у якой сын співаўся. Зусім малады хлопец. Была мэта выратаваць. Мама гатова была ахвяраваць усім, грошы назапашвала, каб яго вылечыць. І дзякуючы ёй усё атрымалася. Я дасканала вывучыла праблему: са спецыялістамі гутарыла, літаратуру чытала. Мы знайшлі для хлопца курс рэабілітацыі. Яна заняла паўгода. І ведаеце, адбыўся сапраўдны цуд. Ён пераадолеў залежнасць. Больш за тое, сёння ён дапамагае іншым: ён цяпер лідар у гуртках ананімных алкаголікаў. І гэта вельмі важна — праблема ж масавая!

Не адварочваюцца ад яе і ў Жыровічах:

— Святары сумесна з таварыствамі ананімных алкаголікаў арганізуюць семінары, збіраюць вялікія аўдыторыі — па 500 і больш чалавек, з розных куткоў краіны з'язджаюцца. Супольна можна адолець гэтую напасць, я веру.

У многіх сферах Святлане Пішч давялося стаць спецыялістам на дэпутацкай пасадзе, а вось спецыялістам у бізнэсе яна ўжо была. І натуральна, заканадаўствам у гэтай сферы цікавіцца ўшчыльную. Ініцыявала нават выязны дэпутацкі семінар па праблемах малога і сярэдняга бізнэсу ў сваёй акрузе — Баранавічах. Тады абмяркоўвалася шмат вострых пытанняў, у тым ліку і неабходнасць адмены ліцэнзіі на розьнічны гандаль. Семінар, відаць, адыграў не апошнюю ролю ў тым, што яна была нарэшце адменена.

СТАР. 3

### «Дапамог» прадаць

**Беспрацоўны з Гомеля выступіў пасярэднікам у продажы аўтамашын і ашукаў даверлівых жыхароў Брэста.**

Без аўтамашын засталося чацвёра грамадзян, а «пасярэднік» нанёс ім страты ў памеры 42 500 долараў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША 4 960,00 | 1 чэшская крона 291,97 | USD 27,7169 |
| ▲ 1 еўра 7 151,82 | 1 польскі злоты 1 794,66 | 10 UAH 34,6548 |
| 1 латвійскі лат 10 063,91 | ▲ 1 расійскі рубель 178,95 | 10000 BYR 55,7012 |
| 1 літоўскі літ 2 068,05 | 1 украінская грыўня 620,19 | EUR 39,9484 |

## Вяртанне з вайны

**Сваякі старшага лейтэнанта Георгія Смятаніна, які знік без вестак ў 1944 годзе, праз столькі гадоў знайшлі месца яго пахавання ў Бабруйскім раёне.**

У 26 гадоў Георгій загінуў у баях за вызваленне Бабруйска. Ён пайшоў на фронт, нягледзячы на хваробу сэрца. У Кіраўскай вобласці Расіі ў яго засталіся жонка і маленькая дачка. Фотакартка з гордым надпісам «Глядзіце, радуйцеся, я — воін Чырвонай арміі!» — гэта адзінае, што засталося на памяць.

Пасля вайны сваякі Смятаніна настойліва шукалі звесткі пра яго, але даведаліся толькі пра тое, што ён браў удзел у баях за Беларусь. Урэшце дапамагла ветэранская арганізацыя Бабруйска: на вясковых могілках у Шчаткаўскім сельсавеце ёсць помнік савецкім воінам, дзе знайшлося і прозвішча Георгія Смятаніна. Цяпер яго дачка і ўнукі прыехалі на магілу бацькі і дзеда.

Увогуле там, дзе быў знакаміты «Бабруйскі кацёл», загінула шмат людзей — і немцаў, і нашых. На тэрыторыі Бабруйскага раёна пахаваны 32 тысячы салдат Вялікай Айчыннай вайны, і толькі 2 тысячы імёнаў з іх цяпер вядомыя.

**Ілона ІВАНОВА.**

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

ТРАДИЦИИ НАДЕЖНОСТЬ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

ОАО «Белвнешэкономбанк»
г. Минск, ул. Мясникова, 32

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2011 г. | на 01.07.2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 133 655,0 | 62 513,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 2 441,5 | 2 952,4 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 2 127 786,5 | 46 225,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 1 146 396,6 | 378 553,3 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 270 872,9 | 213 439,5 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3 946 161,8 | 1 507 573,6 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 53 378,3 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 8 990,0 | 5 871,6 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 105 885,7 | 84 311,2 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 1,2 | 564,5 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 71 823,1 | 21 254,2 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 7 867 392,6 | 2 323 258,8 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 1 161 854,6 | 659,7 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 3 767 461,2 | 468 950,4 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 2 017 894,2 | 1 046 993,7 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 2 618,0 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 289,6 | 869,0 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 84 683,8 | 32 074,7 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 7 032 183,4 | 1 552 165,5 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 605 017,0 | 605 017,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 36 757,2 | 30 584,0 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 69 823,1 | 58 134,9 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 123 611,9 | 77 357,4 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 835 209,2 | 771 093,3 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 7 867 392,6 | 2 323 258,8 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2011 г. | на 01.07.2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 232 664,6 | 138 499,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 115 031,4 | 44 870,3 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 117 633,2 | 93 628,7 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 47 237,7 | 32 199,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 18 311,4 | 4 533,4 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 28 926,3 | 27 665,9 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными мелаллами и драгоценными камнями | 203 | 1 824,4 | 399,3 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 101,8 | 70,6 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 14 465,7 | 10 972,6 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 35 887,6 | (253,9) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 36 991,0 | 31 172,0 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7 859,9 | 5 490,2 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 90 696,7 | 61 702,8 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 12 236,0 | 7 430,2 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 66 775,2 | 37 668,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 12 858,8 | 5 303,4 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 53 916,4 | 32 365,0 |

И.о. Председателя Правления — О.Г. Прохорчик

Главный бухгалтер — З.С. Кушнерова

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 6 от 27.10.2006. УНП 100010078.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МАГУТНЫ ЦЫКЛОН АБРЫНУЎСЯ НА ЕЎРОПУ



**Магутны цыклон у выглядзе моцных навальніц са шквалістымі ветрамі і ліўнямі абрынуўся на Еўропу, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Напярэдадні навальнічны фронт прайшоў па тэрыторыі Польшчы, прычым праліўныя дажджы суправаджаліся ўраганным ветрам. Пашкоджанні атрымалі дзясяткі дамоў. Некалькі гарадоў, у тым ліку Варшава, затопленыя, ёсць загінулыя і параненыя.

Той жа цыклон дадаў працы і экстранным службам Чэхіі. Там ураган пакінуў без даху над галавой не менш як сто чалавек. Рэкі выйшлі з берагоў, скляпы і першыя паверхі будынкаў затоплены вадой. Першая, найвышэйшая, ступень пагрозы паводкі абвешчана на 11 рэках. З-за пагрозы стыхійнага бедства выратавальнікі ўжо эвакуявалі ў бяспечную зону больш за 100 дзяцей і 20 дарослых.

Улады папярэджваюць жыхароў і турыстаў пра пагрозу паводкі і просяць уважліва сачыць за змяненнем надвор'я.

Акрамя таго, 20 ліпеня ў Рызе выпала 37 мм ападкаў, што складае 46% месячнай нормы. Навальніцы і праліўныя дажджы затапілі вуліцы горада, стварыўшы праблемы для кіроўцаў. У сталіцы Латвіі таксама выпаў град, а моцны вецер ламаў дрэвы. Ад удару маланкі абрынулася сцяна пяціпавярховага нежылога дома ў Рызе.

Тым часам не толькі Еўропа пакутуе ад капрызаў надвор'я. У ЗША з-за спёкі загінулі як мінімум 22 чалавекі. Кітай і Бразілію захліснулі разбуральныя паводкі, а на поўдзень Японіі абрынуліся небывалыя тайфуны, якія нагадваюць сакавіцкую прыродную катастрофу.

### АЎТОБУС ЗГАРЭЎ НА ХУТКАСНАЙ ШАШЫ Ў КІТАІ: 41 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЎ

**Двухпавярховы аўтобус, абсталяваны 35 пасадачнымі месцамі, згарэў учора на хуткаснай шашы каля горада Сіньян правінцыі Хэнань у цэнтральным Кітаі. Як паведамляюць інфармагенцтвы, у агні загінуў 41 чалавек.**

Аўтобус атрымалася патушыць праз дзве гадзіны пасля пачатку ўзгарання. Выратавальнікам удалося вызваліць з ахопленага полымем аўтобуса шэсць чалавек, у тым ліку кіроўцу. Усе яны былі накіраваны ў бальніцу, адзін пацярпелы знаходзіцца ў цяжкім стане.

### РЫЗЫКУ РАЗВІЦЦЯ РАКУ Ў ЖАНЧЫН ЗВЯЗАЛІ З РОСТАМ

**Брытанскія даследчыкі высветлілі, што рызыка захварэць на розныя формы раку ў жанчыны залежыць ад яе росту, паведамляе WebMD.**

Супрацоўнікі Оксфардскага ўніверсітэта прааналізавалі звесткі 1,3 мільёна жанчын сярэдняга ўзросту, якія ўдзельнічалі ў даследаванні з 1996 па 2001 год і назіраліся ў сярэднім 10 гадоў кожная. Падчас назірання ў 97 376 з іх развіўся рак.

Жанчын падзялілі на шэсць груп у адпаведнасці з іх ростам. Сярэдні паказчык росту склаў ад 160 да 162,5 сантыметра. Розніца паміж самай нізкай і самай высокай удзельніцамі даследавання была каля 21 сантыметра.

Высветлілася, што чым вышэй жанчына, тым больш яна рызыкуе захварэць на якую-небудзь форму раку. У сярэднім з кожнымі 10 сантыметрамі росту паказчык рызыкі павялічваўся на 16 адсоткаў. Прычым гэтая заканамернасць не залежыць ад такіх фактараў, як узрост, сацыяльна-эканамічнае становішча, індэкс масы цела, ужыванне алкаголю, фізічная актыўнасць, выкарыстанне аральных кантрацэптываў і гарманальнай замяшчальнай тэрапіі, а таксама іншых фактараў рызыкі развіцця пухлін.

ISSN 1990 - 763X

# УСЕ Ў САД!

Фазэнда


Сяргей і Кацярына БАРСУКОВЫ ў сваім садзе

### СУПРАЦЬ ГОЛАДУ

Сяргей Барсукоў нарадзіўся за 8 месяцаў да пачатку вайны. У родную вёску на Гомельшчыне прыйшлі немцы, якія papалілі хаты. Жанчыны з малымі туліліся ў будынку школы, галадалі і сталі хварэць на тыф.

— Мой старэйшы брат памёр, а я выратаваўся, — узгадвае сёння Сяргей Сяргеевіч, паважаны чалавек і пенсіянер. — За мяне маліліся ўсе і дапамагалі, каб я выжыў. І я даў сабе слова пайсці ў сельскую гаспадарку: каб ушанаваць людзей, якія мяне выратавалі, і каб больш ніхто не галадаў.

Сваё слова ён стрымаў. Спачатку працаваў у саўгасе і на практыцы стаў добрым спецыялістам у садаводстве, а потым, каб атрымаць тэарэтычныя веды, пайшоў у Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію.

Сяргей Сяргеевіч усё жыццё адпрацаваў у розных гаспадарках, займаўся усімі магчымымі раслінамі, а кар'еру скончыў выкладаннем сельскагаспадарчых дысцыплін у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце. Ён і сёння гатовы вучыць людзей, як правільна вырошчваць экалагічна чыстую садавіну і гародніну, харчавацца з уласных сотак з карысцю для здароўя.

### ДОБРАЯ ЕЖА

Муж і жонка Барсуковы жывуць у каменных джунглях Магілёва, але ў цёплы сезон перабіраюцца ў Прысна, што ў прыгарадзе Магілёва, на сваё лецішча. На зямельным участку ў палову гектара Сяргей Сяргеевіч пры дапамозе сваякоў зрабіў паказальную гаспадарку, дзе фактычна вырошчваецца вельмі запатрабаваная цяпер у прагрэсіўнага чалавецтва organic food.

— Гэта значыць экалагічна чыстая ежа, вырашчаная на натуральных арганічных угнаеннях, а не з дапамогай хімікатаў, — тлумачыць Барсукоў. — Кожны можа вырасціць на сваім кавалку зямлі экалагічна чыстыя садавіну і гародніну.

Пестыцыды Барсуковы ўжываюць ў мінімальнай колькасці: каб толькі аднойчы паганяць жукоў на бульбе ці тэрмінова зняць тлю. А ўвогуле для барацьбы са шкоднікамі і хваробамі выкарыстоўваюць расліны — горкі палын, падтыннік, аксаміткі, календулу.

— Мы вырошчваем для сябе, — кажа гаспадар. — З душой вырошчваем і ўжываем у ежу. Тады і ежа на карысць, лепш засвойваецца. З гэтых 50 сотак кормяцца тры сям'і, а лішкі прадукцыі мы прадаём на рынку. Раю пакупнікам знаёміцца на рынку з такімі прадаўцамі, якія самі вырошчваюць экалагічна чыстаю прадукцыю. Мы жадаем дабра людзям, як і сабе.


З гэтага агрэсту зробяць варэнне з лімонам і апельсінам

### ЗДАРОЎЕ І ГРОШЫ

Гаспадары раскрываюць сакрэты здароўя. Напрыклад, на ўчастку растуць глог, ажына, чорныя парэчкі (незвычайна буйныя ягады гатунку «Лайдак»), маліна і мята. З іх лісця гатуецца аздараўленчая натуральная гарбата, якая, сцвярджае Сяргей Сяргеевіч, нашмат лепшая за куплёную.

Ад павышанага крывянога ціску Барсукоў лечыцца калінай, халестэрын перамог дзівасілам, а самымі лепшымі лекамі ён лічыць працу на зямлі.

— Зямля і расліны даюць сілы мужу, — пацвярджае жонка Кацярына Уладзіміраўна.

— Трэба быць з зямлёй і не баяцца працы, — вучыць муж. — Я працую цэлы дзень у садзе і на градах, і няма праблемы з ціскам. Як толькі трапляю ў горад, паляжу на канапе і тэлевізар пагляджу — і, калі ласка, трэба таблеткі есці.

Акрамя аздараўленчага эфекту, сёння сад і агарод даюць сваім уладальнікам упэўненасць у заўтрашнім дні. Нездарма антыкрызісныя парады вопытных людзей гучаць прыкладна так: прыдбайце кавалак зямлі і атрымайце ўпэўненасць, што пракорміце сябе і дзяцей.

— Так, падчас эканамічных цяжкасцяў у звычайных людзей харчаванне вылучаецца на першы план, — пагаджаецца Сяргей Сяргеевіч. — І сапраўды, калі ёсць зямля, то адчуваеш сябе моцна на нагах. Ад зямлі ніколі не трэба адрывацца. Адарвешся — страціш апору. Я не баюся крызісаў: трэба больш працаваць, рухацца. Як-небудзь пракормімся.

### ДАХОДНЫЯ ЯГАДЫ

У Сяргея Сяргеевіча рукі чалавека, які шмат працуе на зямлі. Тым не менш, яны не толькі трымаюць матыку ці рыдлёўку. Барсукоў шмат піша, і ў розных часопісах друкуюцца яго парады па вырошчванні раслін.

Парады ён падмацоўвае продажам саджанцаў, прычым (і гэта прынцыповая рэч для Барсукова) вельмі танна. Ён падлічыў, што амаль за 40 гадоў працы прадаў людзям 200 тысяч саджанцаў пладова-ягадных раслін добрых гатункаў. А летась магілёўскі садавод дапамог Баркалабаўскаму жаночаму манастыру.

— Да мяне прыехалі дзве маладыя жанчыны на іншамарцы і адвезлі мяне ў Баркалабава, — расказаў пра свае ўражанні Сяргей Сяргеевіч. — Манашкі папрасілі парад і дапамогі. Я разам з сёстрамі пасадзіў чорныя парэчкі, маліны, клубніцы, каштаны і лекавыя расліны. У адказ жанчыны мяне пачаставалі малаком. Ад працы і стасункаў у Баркалабаве нейкія духоўныя сілы з'яўляюцца.

Аднак духоўнае сёння можна і трэба спалучаць з даходным. Якраз цяпер, лічыць Сяргей Сяргеевіч, прыходзіць час, калі праца на зямлі не проста фармальна лічыцца высакароднай, але і можа даць добрыя даходы. Калі з розумам падысці і ведаць кан'юнктуру рынку:

— На бульбе летась можна было пабагацець. Ды і сёлета ў цане тая ж бульба, ягады — маліна і агрэст, нават буракі. Таму што лімоны і апельсіны так падаражэлі, што не ўсе іх могуць сабе дазволіць. Ды і яны апрацаваныя хімікатамі для захоўвання, таму варта выбіраць сваё.


Сяргей Сяргеевіч вырошчвае маліну на радасць унучкі Марыны

### МАЛІНА Ў КЛІМАЦЕ

Ва ўмовах змянення клімату аматарам садаводства і агародніцтва давядзіцца цяжка. Улетку цяпер нездарова спякотна, а ўзімку расліны пакутуюць ад вялікіх маразоў. Сяргей Сяргеевіч таксама пацярпеў: летась вымерзла ўнікальнае слівавае дрэва, на галінах якога збіралі плады розных гатункаў.

— Так, раслінам ад кліматычных змен цяжка так, як і людзям, — гаворыць спецыяліст. — Аднак і ў такіх умовах можна атрымліваць добрыя ўраджаі. Я раю людзям мяняць старыя расліны на новыя, прагрэсіўных гатункаў, якія могуць выжываць у складаных умовах.

Сакрэт поспеху — інавацыі, усё самае новае і перадавое. Напрыклад, Барсукоў дэманструе рэмантантную маліну. Яна дае плады пазней, чым звычайныя гатункі, але затое на ягады не нападаюць шкоднікі.

— Акрамя гэтага, такую маліну абразаюць увосень да зямлі, яна не пакутуе ад маразоў, а новыя галіны ў першы ж год даюць буйныя смачныя ягады, — тлумачыць Сяргей Сяргеевіч. — Паглядзіце: вось «Бабіна лета», вось «Недасягальныя», вось «Геракл».

Барсукоў можа гадзінамі размаўляць пра дрэвы, расліны і іх гатункі. Ён з гордасцю дэманструе грушы «Беларускія позьнія» — невялікія і прыгожыя дрэвы, усе галіны якіх нібыта засыпаны пладамі, што выспеюць і будуць вельмі смачныя. У яго садзе 18 гатункаў яблыняў, у тым ліку і «Проста Марыя», якая прысвячаецца ўтульным аматаркам тэлевізійных серыялаў.

### АГРЭСТ НА ЗДАРОЎЕ

Адна з любімых культур у садзе Барсуковых — агрэст. Унукі Марына і Рома вельмі любяць ягады, праўда, не вельмі любяць іх збіраць. Усяго ў садзе 17 кустоў агрэсту, і сярод іх ёсць ужо агрэст і новага гатунку — без калючак.

На гасцей найбольшае ўражанне робіць агрэст «Малахіт» — буйныя і салодкія ярка-зялёныя ягады, больш падобныя на ківі. Вось з гэтага самага «Малахіту» Кацярына Уладзіміраўна і робіць варэнне. Хоць варэннем гэта цяжка называць — варыць яго якраз і не трэба.

— Можна перацерці ў звычайнай мясарубцы кілаграм агрэсту на кілаграм цукру і проста замарозіць, — расказвае гаспадыня. — А яшчэ лепей — 2 кілаграмы агрэсту на 2 кілаграмы цукру, плюс лімон і апельсін. Заліць у стэрылізаваныя слоікі і захоўваць у халадзільніку. Варыць не трэба! Гэта больш здаровы варыянт. Смакота!

— Агрэст увогуле добра ачышчае сасуды, а цяпер такія праблемы не толькі ў старых, але і ў маладых, — тлумачыць Барсукова. — Гэтыя ягады паляпшаюць абмен рэчываў пры атлусценні, паніжаюць ціск і супрацьдзейнічаюць з'яўленню ракавых утварэнняў.

Барсукоў-старэйшы, ведама, імкнецца перадаць свае веды і любоў да зямлі дзецям і ўнукам. Сын пайшоў па бацькоўскім шляху — працуе ў сельскай гаспадарцы. З унукамі яшчэ не вельмі зразумела, аднак і цяпер малыя бягуць у сад да дзеда пакаштаваць смачны і карысны агрэст.

Сяргей Сяргеевіч падсумоўвае расповед пра свой сад і стыль жыцця:

— Я свае сілы бяру ў працы, чыстым паветры і натуральных харчах, чаго і ўсім добрым людзям жадаю!

**Ілона ІВАНОВА.**

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# І ЗМОЎКЛА РАДЫЁ...



Удзельнік вайны з Бешанковічаў Пётр Мікітавіч Гнеўка кожную раніцу прачынаецца з першымі гукамі радыёкропкі. Пад гукі маленькага насценнага радыё праводзіць ён і кожны свой пражыты дзень. А ветэрану ўжо 87 гадоў. Просценькі дынамік з рэгулятарам гучнасці — любімец і сапраўдны спадарожнік нашых пенсіянераў. Нездарма ён нязменна вісіць на кухнях ці над ложкамі ў вясковых хатах і гарадскіх кватэрах. Калі раптам радыёкропка перастае працаваць, жыхары адчуваюць сябе не зусім камфортна. Асабліва старыя і самотныя людзі, у якіх зносіны з іншымі вельмі абмежаваныя. Пётр Мікітавіч жыве адзін, і радыё для яго — незаменная частка побыту. Але яно ўжо чацвёрты месяц маўчыць. Нібы з адарваным языком.

«Сяджу, як у кацялку», — сумна, але вобразна выказаўся пенсіянер.

Радыё на вуліцы Полацкай у Бешанковічах замаўчала ў сакавіку, калі мяняліся апоры электраліініі. З імі былі абрэзаны драты для радыёкропак. Больш за сорак прысядзібных дамоў вуліцы засталіся без знаёмых кожнаму з маленства пазыўных, без мясцовых навін і абвестак. Палова жыхароў вуліцы — пенсіянеры. Менавіта яны і сталі ініцыятарамі звароту ў Бешанковіцкі райвыканкам з просьбай вярнуць ім радыё.



«Вочы не бачаць, каб чытаць газеты і глядзець тэлевізар, а мы хочам чуць і ведаць пра жыццё ў сваім горадзе і раёне, у краіне», — кажуць пенсіянеры. Адказ, які яны нядаўна атрымалі з райвыканкама, іх не задавальняе. У ім паведамляецца, што на аднаўленне радыёфікацыі не хапае сродкаў. Колькі трэба тых сродкаў, не ўказваюць.

«Мы ведаем, што ў гасцініцы, якая знаходзіцца ад нашай вуліцы бадай за сто метраў, усталявана каля двух дзясяткаў радыёкропак. Чаму ж нас ігнаруюць? Чаму замест радыёкропкі нам навязваюць набываць прыёмнікі на ўльтракароткіх хвалях прыёмнікі?»

Пераходзіць на новы від мясцовага радыё жыхары вуліцы Полацкай і суседніх Энгельса і Ганчарнай не спяшаюцца. Не таму, што за прыёмнікі трэба плаціць і што дагэтуль бярэцца плата за праваднoe радыё, якое не працуе. І нават не таму, што новае радыё недаўгавечнае і не надзейней за папярэдняе, — гэта звычайны дынамік, які прапісаўся ў гэтых хатах яшчэ з пасляваенных часоў. Крыўдзіць абыякавасць, што адключылі, не параіўшыся з жыхарамі, не спытаўшы іх думкі і тым больш згоды.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**
*г.п. Бешанковічы.*



# АНТЫКРЫЗІСНАЯ ВЯЧЭРА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Сёння дэпутат прапануе папраўкі ў закон аб банкруцтве, які нядаўна паступіў у парламент. Яны датычацца дзейнасці антыкрызісных кіраўнікоў. Парламентарый бачыць не толькі праблему, але і магчымыя рашэнні. Напрыклад, павысіць кантроль за антыкрызіснымі кіраўнікамі з боку дзяржаўных органаў, у тым ліку Гаспадарчага суда, прадаваць прадпрыемства праз таргі — па выгаднай, канкурэнтнай цане...

Вопыт кіравання буйной фірмай быў прыдатны народнай выбранніцы і ў працы над іншымі законапраектамі, напрамую з бізнэсам не звязанымі.

— Кіраўнік прадпрыемства сутыкаецца з усімі сферамі заканадаўства. І падатковае, і працоўнае, і з пастаўшчыкамі яму кантактаваць даводзіцца — вялікі ў яго кругагляд.

Асабіста дэпутат курыравала праект закона аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні, які ўжо прайшоў пробу першым чытаннем і цяпер рыхтуецца да другога.

— Мы сваёй камісіяй выязджалі ў Пружаны, дзе было аб'яднанне двух пасялковых і аднаго сельскага Савета. Там яно вельмі ўдалае: людзям стала бліжэй дабірацца да адміністрацыйнага цэнтра, каб атрымаць нейкую даведку. Лягчэй цяпер афармляюцца і самі дакументы: штат жа стаў буйнейшы, чым у таго ж сельсавета — тут больш спецыялістаў, кожны займаецца сваім участкам. Больш карысці справе, а выйграе ад гэтага найперш жыхар — яго цяпер лепш і хутчэй абслугоўваюць. Тут, я лічу, усе ў выйгрышы.

Але ўдалая практыка Пружанаў не азначае, што закон змусіць аб'ядноўваць павальна ўсіх па нейкіх фармальных крытэрыях.

— Праект закона проста дае такую магчымасць — там, дзе ад гэтага будзе карысць. І што самае важнае, ён рэгламентуе, што на кожным этапе павінна ўлічвацца меркаванне мясцовых жыхароў і якім чынам гэта павінна рабіцца. З месца заўжды лепш відаць, — упэўнена дэпутат.

Галоўны рэцэпт удалай парламенцкай «кухні», на яе погляд, у тым і заключаецца, каб абмяркоўваць законы з народам. Тады кухня заканатворчасці будзе прыемнай і карыснай. Ды і пазітыўны настрой нічым не заменіш: з ім лягчэй перажыць любыя нягоды.

### Кулінарныя падказкі ад Святланы Пішч

**У спякоту прыемна жывіцца і асвяжацца малочным кактэйлем. Усяго і трэба — змяшаць у блэндары малако ды ягады (добра, калі з уласнага саду, як у нашай гаспадыні). Падсаладзіць кактэйль суразмоўніца раіць не цукрам, а... зефірынкай! Без дабаўлення цукру напой атрымаецца не празмерна салодкім, больш густым і лёгкім.**

Дадаць пікантнасці звычайнай салаце з агародніны? Лёгка! Цукрам і лімонным сокам. Зеляніну не рэжам нажом, абавязкова рвём рукамі — каб вітаміны захаваліся. Больш здаровай і карыснай зробіць ежу аліўкавы алей, наша гаспадыня гатуе толькі на ім.

**У жыццярадаснай гаспадыні жыццярадаснае ўсё, нават бутэрброды. Морква на дробнай тарцы, кроп, смятана, крыху солі і перцу. Кладзём перамешаную яркую масу на падсмажаны чорны хлеб і задаволена хрумсцім!**

### Абзац

**У Бабруйскім раёне вадзіцель аўтамабіля «Мазда 626» не справіўся з кіраваннем, легкавушка вылецела ў кювет і перакулілася. Кіроўца ад атрыманых траўмаў памёр на месцы. Паводле інфармацыі ДАІ, кіроўца — 27-гадовы жыхар Бабруйска быў пазбаўлены правоў, а таксама двойчы прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за паўторнае на працягу года кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане. У момант аварыі мужчына не быў прышпілены рэменем бяспекі.**

У горадзе Старая Руса Наўгародскай вобласці двухтыднёвы хлопчык памёр ад атручэння грудным малаком пітушчай маці. Жанчына падазраецца ў прычыненні смерці па неасцярожнасці. Як адзначаюць спецыялісты, 30-гадовая жанчына ў перыяд лактацыі злоўжывала спіртнымі напоямі, пасля чаго неаднаразова карміла груднога сына сваім малаком. Судова-медыцынская экспертыза ўстанавіла прамую сувязь паміж дзеяннямі маці і смерцю немаўляці.

### Поўны абзац

**Прапаршчык выдаваў сабачы корм за кансервы з ялавічыны. Начальнік прадуктовага склада ў адной з воінскіх часцей на Далёкім Усходзе аддрукаваў і наклеіў паўтары тысячы этыкетак «Ялавічына тушаная» на бляшанкі з сабачым кормам, спрабуючы такім чынам схаваць недахват прадуктаў для салдат больш чым на мільён расійскіх рублёў. Як сведчыць ваенная пракуратура, у салдацкія сталоўкі «тушонка» не трапіла. Падставай для праверкі стаў відэазварот маёра Мацвеева да кіраўніцтва краіны з просьбай прыняць тэрміновыя меры. У звароце называліся таксама і іншыя негатыўныя факты.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*


## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| | **ЛОТ 1** |
**10.45, 16.45** Меладрама «Святло ў акне».
**18.30, 0.30** Маст. фільм «Член урада».
**20.30, 2.30** Камедыя «Лятучая мыш».
**22.45, 4.45** Меладрама «Развітальныя гастролі».

### ДОМ КІНО

**3.00** Новы хіт. Камедыя «Сцерва».
**4.25** Драма «Вялікая руда».
**5.55** Музычная камедыя «Дзяўчына з гітарай».
**7.25** Дэтэктыў «Лаўкачы».
**8.45** Музычная камедыя «Сабака на сене».
**11.00** Экранізацыя школьнай праграмы. «Кветкі запаздалыя».
**12.35** Псіхалагічны дэтэктыў «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».
**14.10** Камедыя «Непадатлівыя».
**15.25** Мюзікл па-руску. «Пакуль шалее мара».
**16.40** Новы хіт. Меладрама «Незакончаны ўрок».
**18.10** Камедыя «Каханне—морква».
**20.00** Новы хіт. Трылер «Мечаносец».
**21.45** Золата «Масфільма». «Яшчэ раз пра каханне».
**23.20** Мюзікл па-руску. «Ах, вадэвіль, вадэвіль...».
**0.25** Прыгодніцкі фільм «Чырвоная палатка».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Маст. фільм «Боба і слон».
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Светлячок». М/ф: «Маша і чарадзейнае варэнне», «Бяжы, раўчук», «Волатаўская каша».
**7.00, 11.00** Маст. фільм «Капітан «Пілігрыма».
**8.30, 12.30** Казкі народаў свету. «Жоўты бусел». М/ф «Як Ніначка царыцай стала».
**15.00** Камедыя «Адзінка з падманам».
**16.15** М/с «Светлячок». Казкі Пушкіна. «Казка пра Залатога пеўніка».
**17.00** Казкі Андэрсэна. «Снежная каралева».
**18.05** Легенды і міфы старажытнай Грэцыі. «Арганаўты». М/ф «Высокая горка».

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Паляванне на Папялушку».
**20.00, 2.00** Серыял «Павуціннe-3».
**21.00, 3.00** Серыял «Крывавы круг».
**22.00** Серыял «Чырвонае і чорнае».
**23.30** Серыял «Бераг яго жыцця». 1-я серыя.

### ТБ3

**5.00, 8.00** М/ф.
**6.00** М/ф «Кураж».
**6.30** М/ф «Ліга справядлівасці».
**7.00** М/ф «Бакуган».
**7.30** М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
**8.45** Серыял «Дзіўныя падарожжы Геракла».
**9.45** Маст. фільм «Уладар старонак».
**11.15** Здзіві мяне.
**12.15** Дак. фільм «Страчаныя светы».
**13.15** Маст. фільм «Жанчына-котка».
**15.15** Серыял «Нікіта».
**17.00** Дак. фільм «Апакаліпсіс».
**18.00** Маст. фільм «Калі свякроў монстр».
**20.00** Маст. фільм «Пасылка».
**22.15** Дак. фільм «Жыццё пасля людзей».
**23.15, 4.15** Серыял «Сапраўдная кроў».
**0.15** Маст. фільм «Ночы ў Радансе».
**2.15** Маст. фільм «Чалавек на Месяцы».

### 0.55 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ЭКВАТАР»** **(РАСІЯ, 2007 г.)**

Шалёная камедыя пра прыгоды двух прызыўнікоў у афрыканскай саване. Камандаванне ставіць перад салдатамі невыканальную задачу: дапамагчы мясцоваму племені вывезці з вёскі... слана! У пошуках трактара салдаты ажыццяўляюць небяспечнае падарожжа, у якім ім давядзецца сустрэцца з дзікімі звярамі, бушменамі, амерыканскімі салдатамі і марской пяхотай. Але рускі салдат заўсёды знойдзе выйсце з крытычнай сітуацыі або... выйсце знойдзе яго само...



**Рэжысёр** — Ульяна Шылкіна. **У ролях:** Арцём Чылек, Паула Кавіта, Леанід Акунёў, Пётр Тамашэўскі.

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Серыял «Пётр Вялікі».
**9.45, 17.45, 1.45** Драма «Бобі».
**11.45, 19.24, 3.45** Камедыя «Трушчобныя прагулкі».
**13.30, 21.30, 5.30** Камедыя «Анёл-А».
**15.05, 23.05, 7.05** Меладрама «Кэндзі».

### ТБ1000

**3.00, 21.10** Драма «Смерць у эфіры».
**5.00** Драма «Майкл».
**7.00** Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
**8.50** Драма «Плезантвіль».
**11.10** Драма «Герцагіня».
**13.10** «Прыгоды Амазонкі і гладыятары».
**15.00** Камедыя «Дабіся поспеху».
**16.50** Камедыя «Вялікі Ляботскі».
**19.00** Камедыя «Нявеста, якая ўцякла».
**23.00** Драма «Фанатык».
**1.00** Прыгоды «Доля жанчыны».

### DIVA UNIVERSAL

**5.00, 0.00** Серыял «Джордан расследуе».
**5.50** Серыял «Дамы сям'і Гілмор».
**10.00** «Сапраўдныя гаспадыні Нью-Ёрка».
**11.35** Драма «Хлопец маёй дзяўчыны».
**13.05** Драма «Трупа».
**15.00** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Джэрсі».
**15.50** «Нявеста для мільянера».
**16.40** «Пляткарка».
**18.20** «Вогнепаклоннікі Норы Робертс».
**20.00** «Людзі ў дрэвах».
**22.30** Драма «Вечарынка да ўпаду».

### РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40, 21.30, 0.55** «Прапалая без вестак».
**7.55** «Тайна Лауры».
**12.20, 17.50** «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
**13.20** «Стол на траіх».
**19.35, 1.50** «Спакуснік».
**22.25** «Сэм і Джэнет».
**0.00** «Дона Флор і два яе мужы».
**2.40** «Двaяжэнец».

### AXN-SciFi

**0.20, 5.00, 11.00, 23.35** Зорны крэйсер Галактыка.
**1.50, 16.50, 22.00** Фактар страху.
**2.40, 7.10, 17.35** Чорная лагуна.
**4.05, 8.30, 13.15** Паляўнічыя на прывідаў.
**9.30, 15.15, 20.30** Кайл XY.
**14.00** Страшна цікава.
**14.30, 19.00, 22.50** Жнец.
**19.45** Каралеўскі шпіталь.

### EUROSPORT

**4.00, 11.00, 13.00** Плаванне. Чэмпіянат свету.
**9.30, 12.00, 15.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
**10.00** Аўтаспорт. Гран-пры-3.
**15.00, 17.30** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**16.50** Суперспорт. Чэмпіянат свету.
**18.30, 2.15** Мотаспартыўны часопіс.
**18.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17). Жанчыны. Фінал.
**20.45** Тэніс. Турнір WTA.
**22.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**23.45** Футбол. Кубак свету (U-20).

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 12.00, 18.00** Мегазаводы.
**6.00** Рэкі жыцця.
**8.00** У пошуках акул.
**9.00** На кручку.
**10.00** Малпы ў горадзе!.
**11.00** Самы цяжкі ў свеце рамонт.
**13.00** Небяспечныя сустрэчы.
**14.00** Вялікія міграцыі.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**19.00, 4.00** Супераўтамабіль маркі «Бугаці».
**20.00, 23.00, 2.00** Хрустальная пячора.
**22.00, 1.00** З пункту гледжання навукі.

### DISCOVERY

**7.00** «Маланкавыя катастрофы».
**7.55, 3.50** Вынайсці будучыню.
**8.50, 13.25, 21.00, 2.55** Разбуральнікі легенд.
**9.45, 4.45** Як гэта працуе.
**10.10, 18.00** З чаго гэта зроблена?
**10.40** Палёты ўглыб Аляскі.
**11.35** Браты па багне.
**12.30** Новы выклік Тайсана.
**14.20, 22.00** «Лабараторыя для мужчын Джэймса Мея».
**15.15, 2.00** «Справа тэхнікі!».
**16.10** Атлас Discovery.
**23.00** «Рос Кемп: экстрэмальны свет».
**0.00** «На месцы злачынства».
**1.00** Зброя будучыні.
**5.10** Будаўнічая дапамога.
**6.05** Дзёрзкія праекты.

### TRAVEL

**5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00** Сусветны падарожнік.
**6.00, 20.00, 1.00** Спорт на планеце.
**7.00, 22.30** Пакаранне для абжоры.
**7.30** Пра галоўнае.
**8.00** Рэкі свету.
**9.00, 15.00, 19.00, 23.00** Бясстрашныя падарожнікі.
**11.00** Раджастан — яркая спадчына.
**12.00** Індыйскі час.
**13.00** Экзотыка ў жыцці.
**16.00** Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
**18.00, 0.00** Аўстралія: Маляўнічыя астравы.
**22.00** Шэф-кухар за мяжой.

### ANIMAL PLANET

**7.00** Вуліца лемураў.
**7.25** «Заатур Мікаэлы».
**8.15** «Самае дзікае шоу».
**8.40** Прыроджаныя паляўнічыя.
**9.10, 16.30** «Заасад Крыса Хамфры».
**10.05** «Пякельная котка».
**11.00, 18.20, 0.45, 6.10** Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы — пачатковы курс.
**11.55** Паляўнічы на кракадзілаў.
**12.50** «Дзіўныя прыгоды ў акіяне».
**13.45, 20.10** Перакладчык з сабачай.
**14.40** Уводзіны ў катаводства.
**15.35** Прыгоды Осціна Сцівенса.
**17.25** Рай для шымпанзэ.
**19.15** Паляўнічы на яд.
**21.05, 2.35** Ветэрынар у дзікай прыродзе.
**22.00, 3.30** Планета Зямля.
**22.55, 4.25** Кітовыя войны.
**23.50** Планета мутантаў.
**1.40** Дзікія і небяспечныя.
**5.20** Паліцыя Маямі: аддзел па абароне жывёл.

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Гісторыя хвароб.
**5.40, 20.40** Здароўе ад зоркі.
**6.30, 21.30** Школа розуму.
**7.10** Тайна біялагічнага гадзінніка чалавека.
**8.00, 23.00** Як не страціць здароўе.
**8.40, 23.40** Зялёная аптэка.
**9.20, 18.50, 0.20** Найноўшыя дасягненні.
**9.50, 18.20, 0.50** Шлях да здароўя.
**10.30, 1.30** Дзіця нарадзілася.
**11.00, 16.10, 2.00** Дыялогі пра харчаванне.
**12.00, 3.00** Я расту.
**12.40, 3.40** Энцыклапедыя памылак.
**12.55, 3.55** Памылкі здароўя.
**13.35, 4.35** Дзіцячая медыцына.
**14.00** Генезіс здароўя.
**14.50** Цела чалавека.
**15.30** Колькі вам гадоў?
**17.00** Дзіцячы ўрач.
**17.40** Будзем здаровыя.
**18.45** Азбука здароўя.
**19.30** Нетрадыцыйная медыцына.
**22.10** Як дажыць да 101 года.

### ТДК

**6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 14.30, 22.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00, 23.45** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.30, 2.00** Нашы дзеці.
**15.30** Латарэя «Бінга».
**19.00, 22.30, 4.00** Люстэрка жыцця.
**21.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**1.00** Твой дом.
**3.00** Маст. фільм.

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!*

„РАБОТА ДОСЫЦЬ СКЛАДАНАЯ, АДКАЗНАЯ, АДНАК ТЫЯ, ШТО ПРЫХОДЗЯЦЬ ДА НАС ПРАЦАВАЦЬ, ЯК ПРАВІЛА, ЗАСТАЮЦЦА. І ЗАСТАЮЦЦА НА ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ."

КАНТАКТ
№ 7 (11)
СПЕЦПРАЕКТ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» СУМЕСНА З РУП «БЕЛПОШТА» І РУП «БЕЛСАЮЗДРУК»

„...РАБОТНІКІ НАШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА ЖЫВУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПРАЦАЙ ДЫ ХАТНІМІ КЛОПАТАМІ. ЯНЫ ЗАХОПЛЕНЫ МУЗЫКАЙ, СПЕВАМІ, ТАНЦАМІ..."

## Падзеі

### МТС і «Samsung»: дружба пачынаецца

**Гэтымі днямі буйнейшы аператар сотавай сувязі Беларусі — СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» — і паўднёвакарэйскі канцэрн Samsung Electronics, адзін з сусветных лідараў у вытворчасці тэлекамунікацыйнага абсталявання, падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.**

Дакумент прадугледжвае прыярытэтнае з'яўленне на беларускім рынку ўсёй лінейкі тэрмінальнага абсталявання Samsung (мабільных тэлефонаў, смартфонаў, планшэтаў, мадэмаў) у рознічнай сетцы МТС, а таксама правядзенне партнёрамі агульнай, больш гібкай цанавой палітыкі і рэалізацыі розных сумесных акцый. І першым крокам у рэалізацыі пагаднення, пра што было аб'яўлена журналістам, стане пачатак продажу ў Беларусі флагманскага смартфона Samsung Galaxy S II.

Пагадненне аб прамой дыстрыбуцыі дазволіць нам не толькі пашырыць спектр мабільных прыладаў, што прапануюцца, але і забяспечыць нашым кліентам лепшыя ўмовы ў іх набыцці, падкрэсліў генеральны дырэктар МТС Мікалай Карповіч.

А кіраўнік беларускага Прадстаўніцтва Samsung у Беларусі спадар Йеон Су Чой падкрэсліў, што падпісанне афіцыйнага дыстрыб'ютарскага пагаднення з кампаніяй МТС — важны этап у дзейнасці кампаніі ў Беларусі.

### Кампанія «Вэлком»: на кітайскі лад

**Першы аператар сотавай сувязі ў нашай краіне — кампанія «Вэлком» — узяла пад сваё крыло продаж тэлефона ZTE Blade на базе аперацыйнай сістэмы Android 2.2, які «нарадзіўся» ў Кітаі.**

На прэс-канферэнцыі, прысвечанай гэтай падзеі, яе арганізатарамі было адзначана, што супрацоўніцтва першага GSM-аператара ў Рэспубліцы Беларусь і вядучага пастаўшчыка абсталявання сувязі і сеткавых рашэнняў вельмі актуальнае для беларускіх карыстальнікаў сотавай сувязі, якія зараз змогуць працаваць з самымі «прасунутымі» мабільнымі праграмамі.

Кампанія ZTE развіваецца і стварае канкурэнтныя прапановы ў розных цэнавых катэгорыях, сярод якіх таксама смартфоны на базе папулярнай сёння адкрытай платформы Android, — сказаў начальнік аддзела па працы з тэрміналамі і SIM-карткамі замежнага прадпрыемства «Вэлком» Юрый Грышын.

Кампетэнтна

Анжаліка ДРОБАВА, старшыня аб'яднанай арганізацыі прафсаюза РУП «Белпошта»:

# «Чалавек, які працуе на прадпрыемстве, проста павінен адчуваць, што ён абаронены»

**Аб'яднаная арганізацыя прафсаюза Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» — адна з найбуйнейшых, прычым не толькі ў сталіцы: больш за 30 тысяч працуючых членаў прафсаюза... Пра тое, чым і як яны жывуць, размова са старшынёй Анжалікай Дробавай.**



**— Анжаліка Яўгенаўна, найпершая мэта прафсаюзаў сфармулявана проста — сацыяльная абарона людзей. Між тым паняцце гэта вельмі ёмістае. Тут заробкі, ахова і ўмовы працы, магчымасці адпачынку, жыллё і шмат чаго іншага...**

— Так. Наша прадпрыемства — чым не падстава для гонару — ніколі за ўсе амаль 16 гадоў свайго існавання не дапускала нейкіх затрымак у выплаце заробкаў, заўсёды клапацілася пра паляпшэнне ўмоў працы, рост прафесійнага майстэрства, пра тое, каб самі работнікі, іх дзеці маглі добра адпачываць, развіваць свае таленты. Усё гэта вельмі важна, бо калектыў у нас пераважна жаночы. Самыя масавыя прафесіі — паштальёны, аператары сувязі. Работа досыць складаная, адказная, аднак тыя, што прыходзяць да нас працаваць, як правіла, застаюцца. І застаюцца на дзесяцігоддзі. Значыць, многае нам удаецца.

**— Час такі: усе цяпер мяркуюць, што выгадна, што не выгадна, лічаць грошы. На вашым прадпрыемстве па-ранейшаму вызначаюцца лепшыя раённыя вузлы паштовай сувязі, праводзяцца конкурсы прафесійнага майстэрства, спартакіяды, агляды мастацкай самадзейнасці... Гэта выгадна?**

— Без сумневу. Наш Кузьма Чорны пісаў, што ўсялякая добра зробленая праца павінна быць заўважана, павінна быць адзначана. Словы застаюцца актуальнымі. Прызнанне поспехаў надае новых сіл, падтрымлівае здаровую канкурэнцыю. Летась сярод абласных філіялаў лепшым прызнаны Магілёўскі на чале з Аленай Леанідаўнай Котавай. Штогод мы вызначаем і лепшых з лепшых па асноўных прафесіях — ладзім конкурсы прафесійнага майстэрства сярод аператараў сувязі і паштальёнаў, начальнікаў аддзяленняў паштовай сувязі, што, безумоўна ж, дапамагае людзям сцвердзіцца, павышае прэстыж прафесій і ўрэшце — якасць абслугоўвання нашых кліентаў.

Тая ж мэта і ў спартакіяд — падтрымліваць добрую фізічную форму, добрае здароўе. На прадпрыемстве працуюць спартыўныя секцыі, праводзяцца спаборніцтвы па валейболе, футболе, настольным тэнісе, плаванні, лыжных гонках... Усіх ахвотных стараемся забяспечыць абанементамі ў басейны, пастаянна абнаўляем спартыўны інвентар, касцюмы... У нашай зімовай спартакіядзе брала ўдзел каля 70 чалавек, у летняй — каля 300.

Да паслуг нашых работнікаў і іх сем'яў тры базы адпачынку: «Бярозавы гай», «Парэчча» і «Дружба». Усе яны размешчаны ў маляўнічых кутках Беларусі, усе адрамантаваны, абсталяваны... Зімой вялікага наплыву ў іх, праўда, няма, а вось летам — поўная загрузка! Тая ж самая «Дружба», напрыклад, адначасова прымае 100 чалавек. Забяспечвае камфортнымі нумарамі... Ладзяцца забаўляльныя праграмы, вечары адпачынку ...

Штогод купляем пуцёўкі ў санаторыі і дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. Забяспечваюцца гэтымі пуцёўкамі дзеці ўсіх ахвотных — 100 працэнтаў.

**— Свежыя, відаць, уражанні і ад агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці?**

— Так. Два першыя яго этапы (спачатку ў раённых вузлах паштовай сувязі, потым у філіялах) прайшлі летась, а вось трэці, завяршальны, адбыўся вясной. Удзел у ім брала каля 160 чалавек. Было надзвычай прыемна, што людзі ў нас не толькі выдатныя спецыялісты, — сярод іх проста мора талентаў! І гэта не толькі маё меркаванне: у журы конкурсу мы запрашалі «незалежных экспертаў» — дырыжора аркестра «Няміга», заслужанага артыста рэспублікі А.У.Фёдарава, прафесара кафедры рэжысуры і абрадавых святаў універсітэта культуры А.М. Аляхновіча, загадчыка кафедры духоўнай музыкі з гэтага ж універсітэта В.М. Валатковіча. Яны таксама былі ў захапленні: глядзяць на сцэну, слухаюць і час ад часу пытаюцца: «Кім гэты чалавек працуе? А гэты кім?». Вушам не верылі, калі мы казалі, што паштальёнам, вадзіцелем, цесляром...

Выступалі фальклорныя калектывы, гучала інструментальная музыка, спевы (сола, дуэты, квартэты, вакальныя ансамблі). Конкурс выявіў цудоўных танцораў (быў нават танец жывата), чытальнікаў, артыстаў...

Так што судзіць, вызначаць пераможцаў было вельмі цяжка. Але ж агульнымі намаганнямі... Сярод камандаў на першае месца выйшла вытворчасць «Мінская пошта», на другое — Мінскі філіял, на трэцім з аднолькавай колькасцю балаў Магілёўскі і Гомельскі. Сярод фальклорных калектываў найлепшымі былі прызнаны ансамбль «Жывіца» (вытворчасць «Мінская пошта»), сярод танцораў — аператары паштовай сувязі Таццяна Піліпенка і Лілія Ліхачова (Магілёўскі філіял), сярод музыкаў — Ульяна Каваленка, бухгалтар (вытворчасць «Мінская пошта»), сярод чытальнікаў — Галіна Сцепанчук, сартавальшчыца...

Я сумысля называю прафесіі. Гэта — каб яшчэ раз падкрэсліць, што работнікі нашага прадпрыемства жывуць не толькі працай ды хатнімі клопатамі, што яны захоплены музыкай, спевамі, танцамі.

**— Анжаліка Яўгенаўна, наколькі ведаю, вы таксама можаце ўзяць гітару, заспяваць, прачытаць на памяць нешта з Ахматавай, Цвятаевай. Не рызыкнулі?**

— Не. Мая справа, прынамсі цяпер, усё арганізаваць, прадугледзіць, забяспечыць, заўважыць... Нікога не пакрыўдзіць, не пакінуць без падарунка. Таму да асноўных дыпломаў ды прызоў дадаліся спецыяльныя — «За патрыятызм», «За артыстычнасць», «За непаўторнасць», «За лепшы касцюм», «За арыгінальнасць»...

А вось удзел у спартакіядах раней прымала, і тры гады запар нават займала першыя месцы па настольным тэнісе. Цяпер ужо не выступаю, бо трэба займацца арганізацыяй. Аднак аналагічныя спартакіяды праводзіць адміністрацыя Ленінскага выканкама. І там — да гонару — каманда «Белпошты» заўсёды наймацнейшая!

**— Ветэраны, вядома ж, таксама клопат прафсаюзаў?**

— Безумоўна. Мы думаем не толькі пра тых, хто працуе. Да Дня Перамогі, Дня Незалежнасці заўсёды вітаем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, запрашаем на нашы святы, уручаем кветкі, падарункі, стараемся па магчымасці аказаць матэрыяльную дапамогу. Тых, хто пайшоў на заслужаны адпачынак, пастаянна віншуем з днём пажылых людзей, да ўсіх святаў пасылаем віншавальныя паштоўкі. Дарэчы, кантроль за гэтым самы што ні ёсць строгі, бо мая мама таксама паштавічка, 40 гадоў працавала на вытворчасці «Мінская пошта». І цяпер, калі свята ўжо блізка, а віншаванне позніцца, яна заўсёды тэлефануе, кажа: «Дачушка, нешта ж няма паштовачкі. Ты там правер. Можа, забыліся?». Ну хіба ж пад такім «наглядам» нешта забудзешся?!

Сёлета вось паспрабуем яшчэ адзін конкурс правесці — «Не старэюць душой ветэраны». Бо гэта ж і сапраўды так!

**— Анжаліка Яўгенаўна, на змену ім, ветэранам, прыходзяць выпускнікі вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі і каледжа сферы бытавога абслугоўвання?**

— Так, і з гэтымі ўстановамі ў нас вельмі даўнія добрыя партнёрскія адносіны. Мы прымаем навучэнцаў на практыку, на працу. Але ж, па сабе ведаю, шлях на пошту ў вельмі многіх нашых працаўнікоў пачынаецца куды раней. Нашы прафсаюзныя арганізацыі праводзяць конкурсы-агляды дзіцячых малюнкаў, экскурсіі, на якія можна ехаць усёй сям'ёй — у рэзідэнцыю Дзеда Мароза, у Белавежскую пушчу, Дудуткі, Раўбічы, Лагойск, Жыровіцкі манастыр, у заапаркі... У інтэрнатах, дзе жывуць нашы паштавікі, працуюць спартыўныя секцыі і гурткі па макрамэ і аплікацыі, па вязанні. Праводзяцца выставы лепшых работ. Ёсць клубы, дзе праводзяцца розныя мерапрыемствы... Іншымі словамі, мы зацікаўлены ў тым, каб на пошту прыходзілі дзеці нашых працаўнікоў, іх унукі. Мы — за вернасць прафесіі, за працоўныя дынастыі.

**— Вы, падобна, і ў гэтым падаяце асабісты прыклад, навучаючы (завочна) свайго сына ў вышэйшым каледжы сувязі?**

— Можна сказаць і так. Сувязь — гэта ў нас сямейнае, бо ў ёй працуюць муж і сын. Але гэта было яго асабістае рашэнне. У выхаванні, я лічу, ці не галоўнае правіла «не душыць», не апекаваць. Ён змалку ў нас ведае, што толькі тое галоўнае, чаго дамагаешся сам.

**— Тады скажыце, чаго можна дамагчыся маладому спецыялісту, які прыйдзе працаваць на «Белпошту»?**

— Найперш разам з дыпламам ён атрымае досыць складаную, але цікавую прафесію, працу. А з ёй вельмі шмат магчымасцяў — прафесійнага і кар'ернага росту, вучобы, зносін з людзьмі, падтрымкі сваіх захапленняў, талентаў... Атрымае (па сабе ведаю, бо на «Белпошце» працую амаль 16 гадоў) яснае адчуванне, што ён абаронены, бо сацыяльная падтрымка, у нас не на словах, а на справе. Пастаянна працуе камісія па кантролі за выкананнем Калектыўнага дагавора, людзі нам тэлефануюць, прыходзяць, выказваюць свае прапановы, парады, просяць вырашыць нейкія пытанні... Раз у месяц у непрацоўны час ладзіцца прыём па асабістых пытаннях, раз у квартал выязджаем на месцы — у філіялы. Ніколі і нікому мы не адмаўляем у дапамозе. Напрыклад, у Магілёве на прыём прыйшла адна з нашых працаўніц. Кажа, што яна вельмі цяжка пераносіць пераходы на летні, зімовы час. Кажа: «Як бы вы пасадзейнічалі, каб не было гэтай тузаніны?»... Як ні дзіўна, нават яе пытанне пашчасціла вырашыць.

Але ж гэта жартам, а калі ўсур'ёз... Людзі звяртаюцца з самымі рознымі пытаннямі, зрэдку, здараецца, з крыўдамі, з просьбамі аб матэрыяльнай падтрымцы, са скаргамі...

Дапамагчы ім можна знайсці заўсёды. Было б толькі жаданне і разуменне. «Белпошце» заўсёды шчасціла на генеральных дырэктараў — Георгій Яўгенавіч Ігнатовіч, Аляксандр Міхайлавіч Худалей, Аляксандра Іванаўна Чарняк, Юрый Аляксандравіч Комар... Яны заўсёды бачылі людзей. Пры такім падыходзе старшыні прафсаюзнай арганізацыі працаваць зусім не цяжка. Да таго ж ёсць да каго звярнуцца па дапамогу — да кіраўніцтва галіновага прафсаюза, да гарадскога, ёсць жаданне ва ўсіх вучыцца і працаваць, адстойваць інтарэсы людзей.

**— Ад «Звязды» — шчырыя пажаданні поспехаў!**

— Дзякуй!



# «САЮЗДРУК»: рэалізацыю гарантуем

## Фактар поспеху — усмешка

**«Як маленькі супермаркет» — называе кіёск у Гродзенскай абласной бальніцы хуткай дапамогі прадавец Крысціна Венская. На яе думку, трэба змагацца за кожнага кліента, а адным з фактараў гандлёвага поспеху з'яўляецца... усмешка: «Нават калі кошкі на душы скрабуць, пакупнік тут ні пры чым».**

Выхадных у кіёску не бывае, а месячны абарот гэтай, аднаго з лепшых на прадпрыемстве «Гроднааблсаюздрук» гандлёвага пункта, дзе пазменна працуюць Крысціна Чаславаўна і яе маладая напарніца Вера Каспяровіч **(на здымку)**, апошнім часам дасягае 24 мільёнаў рублёў — за кошт самага разнастайнага тавару, які прапануецца кліентам. Акрамя шырокага выбару газетнай перыёдыкі, гэта і часопісы, кнігі, і гаспадарчыя «дробязі» на розны густ.

— Людзі ў бальніцу прыязджаюць з усёй вобласці, і для іх у нас павінны быць шырокі выбар тавараў першай неабходнасці — тыя ж зубная паста, мыла, расчоскі. А паколькі ў бальніцы шмат маладых маці, то і парфумерыі. Пацыентам бальніцы і медработнікам прапануем таксама «латарэйкі», карткі МТС, талоны і праязныя на грамадскі транспарт, — зазначае **Крысціна Венская.** — Прычым, дакладна ведаю, што многія тавары ў нас таннейшыя, чым у шэрагу іншых гандлёвых пунктаў.

Маладыя маці, дарэчы, не толькі прыхарошваюцца, але і цікавяцца літаратурай пра сям'ю, догляд малых (у прыватнасці, як дзетак назваць?), пра хатнюю гаспадарку. А мужчыны, як правіла, аддаюць перавагу дэтэктывам — іх у кіёску таксама хапае.

Дарэчы, у кіёску можна аформіць і падпіску на газеты, у тым ліку і на «Звязду». Прыемна было пачуць ад Крысціны Чаславаўны, што ў нашай газеты тут ёсць ужо пастаянныя чытачы з ліку работнікаў бальніцы: «Адна жанчына нядаўна сказала, што нешта вычытала цікавае ў «Звяздзе» і панесла гэты нумар па калектыве».

Тавары ў кіёску — у асноўным айчыннай вытворчасці. Напрыклад, вельмі добра цяпер разыходзяцца беларускія пластыкавыя цацкі. Менавіта ім, больш цікавым і надзейным у карыстанні ў параўнанні з кітайскімі, пакупнікі аддаюць перавагу, кажа Крысціна Венская. Але пры гэтым лічыць, што, развіваючы дробны і сярэдні бізнэс, у Беларусі можна вырабляць і прадаваць значна больш.

## ПЕРАДАВІКІ З МЯДЗЕЛА



Прадавец газетнага кіёска № 39 г. Мядзела Людміла Юдыцкая з прызам ад «Звязды».

Падпіска-2011

# «ЯГАДНЫЯ» МАРШРУТЫ СТАРТАВАЛІ



Начальнік АС Порпліша Раіса ЛЫЧКО (на фота справа) уручае электрасушылку Глафіры АТРАХІМОВІЧ.

Нягледзячы на тое, што да разгару падпісной кампаніі на 4-ы квартал гэтага года яшчэ далёка, рэдакцыя газеты вырашала не адкладваць на апошнія дні выезды «ў народ» для ўручэння прызоў сваім падпісчыкам, якія захавалі дружбу з газетай як мінімум на бліжэйшыя паўгода. Тым больш, каштоўныя падарункі на гэты раз даволі арыгінальныя, з прывязкай на летні грыбны-ягадны сезон: сокавыціскалкі, электрасушылкі...

Першы маршрут з такімі прызамі быў пракладзены на Віцебшчыну. На жаль, наша даўняя падпісчыца з Бешанковіч Ганна Пятроўна Скромная з-за сталага ўзросту — у свае 87 гадоў здароўе ўжо не тое, каб пячыся на сонцы — не змагла прыбыць на раённую пошту, каб атрымаць сокавыціскалку «Журавінка». Праўда, дзякуючы ініцыятыве намесніка начальніка РВПС Святланы Васілевіч прыз дойдзе да адрасата своечасова: па даручэнні бабулі, да якой газета «Звязда» прыходзіць у дом каля 40 гадоў, такую неабходную ў гаспадарцы рэч для атрымання вітаміннай прадукцыі атрымала яе ўнучка Ганна, якая прыехала на пошту на аўтамабілі разам з дачкой Палінай. Віншуем!!!

Глыбоцкі раён традыцыйна лічыцца звяздоўскім. Што ні розыгрыш, то прыз абавязкова. Вось і на гэты раз усё атрымалася, як заўсёды: электрапрас. І зноў сустрэча на раённай пошце. Праўда, жыхар Глыбокага Аляксей Пятровіч Кучынскі, якому выпаў прыз, з-за хваробы не меў магчымасці прыйсці самастойна, таму на сустрэчу адправіў сваю жонку Галіну Андрэеўну, якая з задавальненнем яго атрымала.

Бадай, самай пажаданай сустрэча са звяўдоўцамі была для Глафіры Атрахімовіч з вёскі Іванаўна, Докшыцкага раёна. Ужо на другі дзень пасля правядзення розыгрышу прызоў і друкавання ў газеце спісаў яна была ў рэдакцыі. Праўда, каштоўны прыз у выглядзе электрасушылкі не атрымлівала, бо ў руках яго везці цяжка, прызналася яна. Тым больш што «Звязда» абяцала яго прывезці. Сваё слова мы стрымалі, даставіўшы праз некалькі дзён каштоўны прыз на аддзяленне сувязі Порплішчы. У размове з журналістам «Звязды» Глафіра Міхайлаўна адзначыла, што з газетай яна сябруе вельмі даўно. І ў апошнія гады атрымала ад рэдакцыі шмат чаго, што разыгрывалася: набор шпалераў, блендар. І вось — новы прыз. Відавочна, сказала па сакрэце наша падпісчыца з вёскі Іванаўка, што па жыцці яна чалавек аптымістычны і шчаслівы. Не так даўно са сваім мужам Сяргеем Антонавічам згулялі залатое вяселле. А яшчэ Глафіра Міхайлаўна Атрахімовіч вельмі ўдзячна начальніку АС Порпліша Раісе Лычко, якая ў свой час «сасватала» газету «Звязда». Дарэчы, Раіса Паўлаўна і падчас нашага прыезду падтрымала сваю зямлячку, склаўшы ёй кампанію ў адмысловай «фотасесіі». Відавочна, удзвюх жанчынам будзе лягчэй разабрацца з электрасушылкай, якая здольная выступіць добрым памочнікам руплівай гаспадыні.

Фініш нашай паездкі быў запланаваны на Міншчыне ў Мядзельскім раёне. Яшчэ з мінулага розыгрышу «Лепшаму кіяскёру — звяздоўскі прыз» у рэдакцыі газеты электрачайнік чакаў сваіх гаспадынь. Па выніках сумеснага конкурсу газеты «Звязда» і «Саюздрука» імі аказаліся прадаўцы газеты кіёска № 39 г. Мядзела Уладзіслава Шкадун і Людміла Юдыцкая. Дарэчы, менавіта апошняя і была на баявым пасту падчас нашага візіту і атрымала каштоўны прыз. Так трымаць!




Намеснік начальніка Бешанковіцкага РВПС Святлана ВАСІЛЕВІЧ (на фота злева) уручае прыз для Ганны СКРОМНАЙ.

# ПАШТАЛЬЁН ЛЮБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ




Магіляўчанка Валянціна Рандзіцкая 25 гадоў працуе на адным участку і гаворыць, што самае лепшае ў яе працы — гэта чалавечыя зносіны.

— Я ведаю тут усіх людзей! — усміхаецца Валянціна Фадзееўна. — Хто з кім ажаніўся і ў каго колькі ўнукаў. Хто добра жыве і ў каго што баліць. Усе адрасы і прозвішчы назаву па памяці, з заплюшчанымі вачыма.

Яна родам са Шклоўшчыны, і, пераехаўшы ў Магілёў, маладая маці аддала перавагу пошце перад прадпрыемствам з-за больш зручнага графіка працы. Спачатку меркавалася, што гэта толькі часова, але праца падабалася.

— Можа, тут не варта казаць высокія словы пра прызванне, але пошта стала маёй сапраўднай працай, дзе я засталася на ўсё жыццё. Мне падабаецца сустракацца з людзьмі: я знайшла са сваімі кліентамі агульную мову. Адных трэба падбадзёрыць, іншым паспачуваць, з трэцімі разам парадавацца. І добра, што не сяджу на адным месцы, а цэлы дзень у працоўным рытме!

Рандзіцкая працуе паштальёнам на 11-м гарадскім аддзяленні сувязі больш за 30 гадоў. Кожны свой дзень яна пачынае з ранішняга прыбірання працоўнага месца і сартавання карэспандэнцыі. Сярод газет, якія выпісваюць на ўчастку Валянціны Фадзееўны, ёсць і «Звязда». Яна і сама любіць чытаць газеты, у тым ліку і наша беларускае выданне.

— Мой участак вялікі: гэта прыватны сектар, які ў Магілёве называюць Чапаеўкай, — расказвае яна. — Тут жыве шмат пенсіянераў, якія не страчваюць сваёй жыццёвай звычкі атрымліваць чытаць газеты і часопісы. Праўда, колькасць падпісчыкаў усё ж памяншаецца з цягам часу: цяпер вось крызіс наш паўплываў, людзі эканомяць, цэны немаленькія. Але на ўсім участку зусім няшмат адмовіліся ад падпіскі. Можа, толькі каму выпала абраць больш танныя перыядычныя выданні. А так народ газеты выпісвае.

Усе калегі Валянціны Рандзіцкай — жанчыны, і яны ўпэўнены, што паштальён — гэта усё ж такі тыповая жаночая праца. Нават нягледзячы на тое, што яна фізічна досыць цяжкая. Кайстра патрэбна паштальёну вялікая: акрамя перыёдыкі і лістоў, жанчыны нясуць сваім кліентам замоўленыя імі тавары.

Валянціна Фадзееўна ўжо дасягнула пенсійнага ўзросту, але выглядае вельмі рухавай, спрытнай жанчынай. Простыя гумавыя басаножкі — самы прыдатныя для паштальёнкі летні абутак. Адзенне ў спартыўным стылі — прасторная кашуля і штаны. Знешняе аблічча падпарадкавана рытму працы, каб бегчы хутчэй і ўсё паспяваць.

А кемлівасць, якая эканоміць час, да паштальёну прыходзіць з часам: без звычкі лёгка прабегчы патрэбны дом і забыцца, каму прапанаваць латарэйныя квіткі, а каму — прысмакі.

— Вядома, часу паштальёну не стае, трэба шчыраваць, — расказвае Валянціна Фадзееўна. — Аднак я люблю паразмаўляць з людзьмі і заўсёды знаходжу час, каб сказаць ім хоць некалькі добрых слоў.

Вопытны паштальён расказвае, што ёй адразу ж відаць: ці адзінокі чалавек перад табой, ці патрабуецца яму дапамога. Калі бабуля цэлымі днямі адна сядзіць у хаце, то ёй любое добрае слова будзе прыемна — хоць простае шчырае прывітанне.

— Усе навокал ляцяць, спяшаюцца, мітусяцца. А я аддам некалькі хвілін для размовы, і не толькі чалавеку прыемна, але і мне самой: нібыта добрую справу зрабіла, падтрымала чым магла. Вось днямі дачка ў жанчыны паехала ў далёкае падарожжа і да маці не патэлефанавала. Тая хвалюецца, накручвае сябе, панікуе, аж рукі калоцяцца. Што рабіць? Куды бегчы? А я кажу: «Трэба супакоіцца, пра дрэннае не думаць, і ўсё будзе нармальна». Так і здарылася.

Для таго, каб стаць добрым паштальёнам, лічыць Валянціна Фадзееўна, патрэбна цярплівасць, моцныя нервы і, абавязкова, добрасумленнасць.

— Трэба быць чэсным чалавекам: мы ж з грашыма працуем, разносім людзям пенсіі. З гадамі заслужыш давер. Цяпер мне яшчэ і свае грошы даюць, каб я аплаціла квіткі. Мы ўсе — як свае людзі, сваякі.

Рандзіцкая ўпэўнена, што прафесія паштальёна не знікне з цягам часу і развіццём новых тэхналогій. «Проста не ўяўляю сабе, што можна жыць без пошты!» — яна нават смяецца з пытання.

Уся сям'я Валянціны Фадзееўны звязвае сваю будучыню з поштай. Дачка Іна аднойчы скарыстала параду маці і пасля скарачэння на прадпрыемстве прыйшла паспрабаваць сябе ў гэтай прафесіі. Працуе і дасюль, ужо 17 гадоў, і нават не задумваецца, каб нешта памяняць.

Унукі Рандзіцкай таксама «прыжываюцца» на пошце. Школьнік Ягор, пакуль не паехаў у летні лагер, разбірае газеты і атрымлівае за сваю працу цалкам заслужанае марозіва. «Мне падабаецца бабуліна праца!» — паведамляе хлопчык.

Таму нездарма ўся пошта для Валянціны Фадзееўны — нібыта вялікая сям'я. Тут жа, у аддзяленні, зроблена імправізаваная выстава твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зробленых рукамі Рандзіцкай. Пейзаж каля сажалкі: яркі певень, жоўтыя сланечнікі, пара белых лебедзяў і лілеі на сінім водным фоне — усё гэты з другаснай сыравіны, у асноўным пластмасавых бутэлек ад напояў і бытавой хіміі, канцылярскіх тавараў.

— Аднойчы ў часопісе чытачы хваліліся рознымі рэчамі, выробленымі сваімі рукамі, — узгадвае паштальён. — І я падумала: няўжо ў мяне нешта прыгожае не атрымаецца? Ну і атрымалася! Хоць на гэта патрабуецца шмат часу і цярплівасці, але гэта таго каштуе. На балконе ў сябе зрабіла буслінае гняздо, ля пад'езда — прыгожае балотца. Я раблю гэта з задавальненнем і дару свае вырабы людзям.

Валянціна Рандзіцкая і яе калегі па 11-м магілёўскім аддзяленні сувязі жадаюць сваім кліентам найперш здароўя і цярплівасці.

— Падаецца, што яшчэ прыйдуць больш добрыя часіны і мы будзем жыць лепш!

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# Газета ў газеце

**У папярэдніх выпусках «Кантакта» мы расказвалі пра тое, як пачыналася жыццё камсамольскай газеты «Чырвоная змена», якая сёння выходзіць у «Звяздзе» як укладка для моладзі. Працягваем гартаць старонкі гісторыі газеты і змяшчаем успаміны выдатнага журналіста, супрацоўніка «Чырвонкі» з 1956 па 1960 гг. Барыса Стральцова. Аўтарская арфаграфія захаваная.**

**(друкуецца па кнізе Раісы Самусенкавай «Вецер гісторыі ў тваіх ветразях...»)**

**«Кругасветка па Беларусі» — камандзіроўка на месяц**

Спецам на розныя прыдумкі ў рэдакцыі лічыўся адказны сакратар Мікола Марушкевіч. Акрамя таго, ён вызначаўся жалезнай дысцыплінай. Прыходзіў на работу раней за ўсіх і позна ўвечары задавальняўся толькі тады, калі бачыў гатовую газету.

(...) І вось неяк увечары мы з Фёдарам Бачылам затрымаліся каля Міколы Марушкевіча. Пагаманілі. Фёдар надоечы акурат новенькага «Масквіча» набыў (...)

Тут Мікола Марушкевіч і кінуў рэпліку: «Была б у мяне машына, ды калі б не гэта катаржоўка ў сакратарыяце, я кругасветку па Беларусі зрабіў бы». Мы тут жа высветлілі, у чым сэнс яго загадкі: зрабіць падарожжа па перыметры, побліз граніц рэспублікі, праехаць усе вобласці і даць серыю нарысаў, замалёвак, рэпартажаў. Спакусліва. Але ж на такі вояж пойдзе мінімум месяц. Хто дазволіць доўгую камандзіроўку? Нас жа звычайна, нагрузіўшы заданнямі па самую макаўку, адпускалі не болей як на тры-чатыры дні. А тут — месяц.

**— Калі ваша згода і ахвота, то дамоўленасць з рэдактарам я бяру на сябе, — паабяцаў Марушкевіч.**

Праз некалькі дзён, прыхапіўшы рэдакцыйную пішучую машынку, фотапрыналежнасці і што-нішто з падарожнага набору, мы ўзялі курс на Віцебшчыну — адтуль меркавалася пачаць кругасветку. Складанасць была ў тым, што ўсю карэспандэнцыю нам загадалі перасылаць у рэдакцыю аператыўна, з дарогі.

Мне было прасцей. Іншым разам я ставіў машынку на пень, калі спыняліся ў лесе, ці на які грудок на беразе возера і шлёпаў па клавішах. На прыродзе пісалася лёгка і хутка. Фёдару ж было цяжэй. Без электраразеткі праяўленую плёнку ў фотаздымак не ператворыш. І ён ехаў шукаць разетку. Паслугамі пошты не карысталіся — доўгі і не вельмі надзейны шлях. Рукапісы і здымкі даволі ахвотна згаджаліся даставіць у Мінск шафёры рэйсавых аўтобусаў. У рэдакцыю тэлефанавалі, калі і дзе іх сустракаць. Ніводзін наш пакет не прапаў. А ўсяго з месячнай вандроўкі мы даслалі шаснаццаць рукапісаў і каля сотні фотаздымкаў. Усё аператыўна ішло ў газету.

Можа, найбольшая карысць ад таго месячнага нялёгкага вояжу была нават не ў публікацыях, а ва ўражанні. Мы ўбачылі Беларусь у яе шматаблічнасці, а людзей — у іх аднаснай роўнасці і прыкметнай рознасці.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі:
У. ЗДАНОВІЧ, В. ДОЎНАР, І. ІВАНОВА, І. ЛАПАТО, Б. ПРАКОПЧЫК.

